# Голас Радзімы

ШТОТЫДНЁВАЯ ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ТАВАРЫСТВА «РАДЗІМА»

№ 4 (2198) 24 студзеня 1991 г. Выдаецца з 1955 г. Цана 8 кап.


**Дарагі замежны чытач! Калі гэты нумар газеты трапіць у твае рукі, магчыма, патухнуць вогнішчы на вуліцах Вільні, разыдуцца варагуючыя бакі і зніknуць умацаванні вакол будынка Вярхоўнага Савета Літвы. Але не патухне ў сэрцах людскіх боль за тыя ахвяры, што прынесла народу Літвы ноч 13 студзеня 1991 года. І бяссільна будзе біцца думка: як магло дайсці да таго!**

**Не пераказваем падзеі, бо пра іх за мяжой ведаюць не менш, чым у нас. Хацелі б толькі пазнаёміць нашых суайчыннікаў з рэакцыяй Вярхоўнага Савета Беларускай ССР на трагічныя падзеі ў Літве. Яна была неадназначнай — ад крайняй асцярожнасці да катэгарычных, няўзважаных меркаванняў. Апазіцыя БНФ прыняла сваю рэзалюцыю з рэзкім асуджэннем прымянення ваеннай сілы ў Літве. Калі Вярхоўныя Саветы іншых рэспублік выступілі ўжо з заявамі, беларускі парламент толькі рашыў паслаць групу з сямі дэпутатаў на чале з Нілам Гілевічам у Вільню з даручэннем: пабачыць на свае вочы, а магчыма і разабрацца на месцы ў прычынах канфлікта, які закончыўся ўмяшаннем узброеных сіл, каб пасля гэтага выказаць сваё стаўленне, даць палітычную ацэнку таму, што здарылася. 17 студзеня адбылося бурнае абмеркаванне падзей у Літве.**

**Ніжэй друкуем выступленне на сесіі Вярхоўнага Савета Беларускай ССР народнага дэпутата Н. ГІЛЕВІЧА.**


**(Заяву Вярхоўнага Савета БССР чытайце на 2-й стар.).**


# ПРАЛІТАЙ КРЫВІ ДАРАВАННЯ НЯМА

Шаноўны прэзідыум, паважаныя дэпутаты! Перш за ўсё я хачу выказаць пэўнае здзіўленне прапановай Старшыні Вярхоўнага Савета Мікалая Іванавіча Дзямянцея — нічога не абмяркоўваць па літоўскай сітуацыі. Маўляў, дэлегацыя ад Прэзідэнта з'ездзіла ў Літву, ва ўсім разабралася, і больш гаварыць няма пра што. Я разумею падтрымку залы, неабходнасць іменна неадкладна пагаварыць па гэтым пытанні, якое ўсіх нас хвалюе і проста не дасць нам спакойна працаваць і разглядаць іншыя пытанні.

Наша дэлегацыя прыехала ў Вільню к вечару. Мы — на жаль, частка дэлегацыі — паспелі яшчэ пабываць у Вярхоўным Савеце, сустрэцца і пагаварыць з намеснікам Старшыні і Сакратаром Вярхоўнага Савета, з міністрам аховы здароўя і з некаторымі дэпутатамі. Назаўтра было пахаванне ахвяр, і на гэта пайшоў амаль увесь дзень — з ранку да вечара, паколькі і мы прымалі ўдзел у пахавальным рытуале.

Тым не менш, мы ўчора паспелі спаткацца з работнікамі Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Літвы, а вечарам прыняць удзел у пасяджэнні Вярхоўнага Савета Літоўскай рэспублікі, дзе нашай дэлегацыі было дадзена слова. Выступіў на гэтым пасяджэнні кіраўнік дэлегацыі, выказаў ад імя нашага Вярхоўнага Савета адносіны да падзей, тое, што можна было сказаць за некалькі прадастаўленых хвілін.

Вельмі цяжка пераказаць уражанні, якія ўсе мы і кожны з нас прывезлі. Я спадзяюся, што апрача мяне выступяць і члены афіцыйнай дэлегацыі, і дэпутаты, якія не ўваходзілі ў афіцыйную дэлегацыю, але — таксама пабывалі ў гэтыя дні ў Вільнюсе. Маё першае ўражанне — гэта ненатуральнасць, нейкая недарэчнасць, уродлівасць самой гэтай сітуацыі, а іменна таго, што мы ўбачылі. Гэтыя абарончыя збудаванні з магутных бетонных блокаў вакол будынка Вярхоўнага Савета, барыкады на вуліцах, якія вядуць да Вярхоўнага Савета, усе гэтыя загароджы, завалы, сцены. Гэтаксама і вогнішчы, якія гараць дзень і ноч, каля якіх грэюцца, якімі вечарамі асвятляюцца, і вогнішчы з узброенымі людзьмі каля афіцыйных будынкаў у Вільнюсе, танкі каля тэлевежы, бронемашыны на ўзбочынах. І тая варажнечая непрымірымасць, якая адчувалася паўсюдна. Усё гэта, паўтараю, здаецца нейкай вялікай ненатуральнасцю, недарэчнасцю ў горадзе, які з'яўляецца адным са старажытных цэнтраў культуры ў нашай краіне, у тым ліку, можа быць, перш за ўсё, калыскай нашай беларускай культуры.

Я ўспамінаю выступленне Прэзідэнта Гарбачова 14 снежня вечарам па тэлебачанню на сесіі Вярхоўнага Савета ў Маскве. У мяне ўжо тады было ўражанне, што мне не даводзілася раней слухаць такой непераканаўчай прамовы Прэзідэнта, як гэта. У мяне было ўражанне, што палітыка нашай краіны — і ўнутраная, і міжнародная — як бы правалілася ў ней-


**(Заканчэнне на 3-й стар.).**




На Каляды свяшчэнніку з Нью-Йорка Полу МОАРУ ўручана Ганаровая грамата Вярхоўнага Савета БССР, якою лідэр вядомай амерыканскай дабрачыннай арганізацыі «Сіціхоўп індастрыз» ўдастоены за актыўную дзейнасць па аказанню дапамогі беларускім дзецям, што пацярпелі ад чарнобыльскай катастрофы.

Уручаючы вышэйшую ўзнагароду рэспублікі, Старшыня Вярхоўнага Савета Беларускай ССР Мікалай Дзямянцей падкрэсліў, што сваім прыкладам Пол Моар паказаў, як можна рэальна дапамагчы дзецям, якіх напаткала вялікая бяда.

НА ЗДЫМКУ: Пол МОАР (у цэнтры) на прэс-канферэнцыі адказвае на пытанні журналістаў.

(Матэрыял аб знаходжанні Пола Моара ў Беларусі змешчаны на стар. 3).

Фота С. КРЫЦКАГА.

# ПРАЛІТАЙ КРЫВІ ДАРАВАННЯ НЯМА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

кую яму, выбрацца з якой вельмі няпроста. Яму трэба выраўняць. Што гэта значыць, як я разумею? Трэба выраўняць усе рэспублікі і народы нашай краіны ў правах, зрабіць раўнапраўнымі, суверэннымі дзяржавамі на справе, а не на словах.

На маё разуменне, прычына прычын тых падзей, што адбыліся ў нашай краіне да Літвы і што адбыліся ў Літве,— недаацэнка нацыянальнага пытання напрыканцы дваццатага стагоддзя. Глухата і слепата да нацыянальных праблем проста невытлумачальныя, нармальнаму разуменню не паддаюцца.



Дарэчы, гэтая глухата характарызуе не толькі пазіцыю афіцыйных вышэйшых улад краіны, але і пазіцыю многіх іншых палітычных і грамадскіх сіл у рэспубліках. Я думаю, што такая ж, я сказаў бы, шкодная пазіцыя і многіх нашых радыкалаў у Беларусі, радыкалаў, якія змагаюцца за дэмакратыю, за справядлівасць, і пры гэтым — поўнае ігнараванне клопатаў, скажам, пра беларускую школу, пра беларускую культуру, мову, пра ажыццяўленне Закона «Аб мовах». І пры гэтым асабістая непавага да беларускай мовы.

Я многа ў гэтыя дні думаў над падзеямі часу і прыходжу да высновы, што тым, хто абвяшчаў перабудову ў нашай краіне, трэба было пачынаць іменна з нацыянальнага пытання, як аднаго з найбольш складаных і цяжкіх для вырашэння. Затым — з выратавання аўтарытэту Камуністычнай партыі і з навядзення сацыяльнага парадку, сацыяльнай справядлівасці ў краіне. Я ўпэўнены, што тады не дайшло б у рэспубліках да самой ідэі сепаратызму, дзяржаўнай адасобленасці. Проста ў гэтым не было б патрэбы, калі б праблемы вырашаліся і былі дэмакратычна вырашаны раней. Народ любой рэспублікі бачыў бы, што мы — у саюзе рэспублік, але мы — поўныя гаспадары на сваёй адвечнай зямлі, і мы жывём так, як лічым лепш і лічым разумным.

Паважаныя дэпутаты, карысць ад абмеркавання сітуацыі ў Літве і не толькі ў Літве, а ў цэлым у Прыбалтыцы і ў другіх рэспубліках, будзе тады, калі мы будзем рабіць высновы з гэтых падзей і з таго, што мы пра іх ведаем, калі мы будзем выводзіць нейкія ўрокі. А ўрокі вельмі цяжкія і вельмі горкія, пакутныя. І можа быць, галоўны ўрок,— што ніякія ўрокі нам не ідуць на карысць. Сумленныя, добрыя грамадзяне краіны спадзяваліся, што пасля сумных падзей у Тбілісі падобнае больш ніколі нідзе ў нашай краіне не паўторыцца. І, аднак жа, гэта паўтарылася. Зноў пралілася кроў па віне тых жа самых антыдэмакратычных сіл. Пралітай крыві і адабраным у людзей жыццям, як вы разумееце, апраўдання не будзе і даравання таксама.

Чаго дабіліся або чаго могуць дабіцца ў такіх сітуацыях пераможцы — нібыта пераможцы? Яшчэ большай нянавісці і непрыязні з боку пакрыўджаных. Яшчэ большага абвастрэння напружанасці палітычнай сітуацыі, у чым наша дэлегацыя і пераканалася ў Літве. Як, напрыклад, пачнуць глядзець адзін на аднаго літоўцы і нелітоўцы з гэтага часу? Недавер яшчэ вырасце, і выправіць становішча будзе яшчэ цяжэй. Хіба гэта ўваходзіла ў задачу Прэзідэнта або Вярхоўнага Савета СССР, ці ЦК КПСС — павялічыць напружанне, яшчэ больш абвастрыць сітуацыю? Хіба гэта ўваходзіла ў кампетэнцыю так званага камітэта нацыянальнага выратавання? Хіба тыя, што пайшлі на гэты крок, не разумелі, які можа быць вынік? Яны павінны былі гэта зразумець. Павінны былі зразумець, што гэта можа стаць поўным паваротным момантам для ўсёй палітыкі ў нашай краіне. І ў поўнай меры, калі хочаце, і для сусветнай палітыкі. Мы ўжо ведаем водгукі свету на гэтыя падзеі. Калі ж людзі гэтага не разумеюць, дык якія ж тады яны палітыкі і дзяржаўныя дзеячы? Прымаюць рашэнні, не заглядваючы нават на адзін, два дні наперад?

Якія яшчэ, на маю думку, урокі напрошваюцца з сітуацыі, што склалася? Я хацеў бы гаварыць пра памылкі Вярхоўнага Савета Літоўскай рэспублікі, якія заключаюцца, я сказаў бы, у недаацэнцы рэальнага стану рэчаў. Лічу, што над гэтым павінны думаць ва ўсіх рэспубліках, і мы з вамі, у прыватнасці.

Працэс суверэнізацыі, набыцця самастойнасці — гэта працэс доўгі, разлічаны на многія гады. Адразу, з ходу, нейкім адным дзеяннем такіх пытанняў не вырашыш. У мяне ўражанне, што ў Літве і ў некаторых іншых рэспубліках, не лічачыся, паўтараю, з рэальным станам рэчаў, рашылі вырашыць гэтыя пытанні як найхутчэй. Мне думаецца, што больш дзяржаўнага розуму было і ёсць у тых дзяржаўных дзеячаў Літвы, якія якраз хацелі б спакайней і паступова вырашаць гэтае пытанне. Заканадаўча і практычна, паўтараю, паступова, без націску, без гвалту забяспечыць эканамічную, палітычную і культурна-духоўную самастойнасць рэспублікі. Падзеі, як бачыце, развіваюцца так, што такія людзі, я маю на ўвазе, перш за ўсё Бразаўскаса, Прунскене, такія людзі наогул адхілены сёння ад многіх пасад.

Другі ўрок, які таксама датычыць не толькі Літвы, Прыбалтыкі, але і нас з вамі. Не трэба распальваць нянавісці да Савецкай улады, да асноў таго ладу жыцця, які дзесяткі гадоў меў месца ў нас— да сацыялістычнага ладу жыцця, гэтаксама, як да камуністаў і Камуністычнай партыі агулам. Бо гэта таксама авантурызм і нежаданне ўлічваць рэальную сітуацыю. Тысячы людзей пражылі дзесяткі гадоў у пэўных сацыяльных умовах, у пэўных палітычных умовах. Людзі вераць, як і верылі, што гэта іх жыццё, іх лёс. Гэта мільёны людзей, і калі іх крыўдзіць непрадуманымі, безадказнымі заявамі, гэтым самым можна толькі выклікаць варажнечу, нянавісць і давесці справу да грамадзянскай вайны. Я вымушаны пра гэта гаварыць таму, што ўжо стала такім звыклым абвінавачваць, скажам, усіх камуністаў агулам. Што проста лічыцца ненармальным, калі ты не сказаў нечага рэзкаадмоўнага, негатыўнага ў іх адрас.

Нядаўна (вы чыталі ў друку) забілі рэдактара абласной газеты Івана Іванавіча Фаміна ў Расіі. Я не сумняваюся, што забілі сапраўднага камуніста. Гэта да ведама тых, хто спяшаецца перш за ўсё абвінавачваць камуністаў. Я амаль не сумняваюся, што забілі прадстаўнікі тых самых сіл, якія б хацелі зрабіць у нас самы горшы пераварот і давесці да канчатковага развалу нашу краіну.

Я хачу сказаць, што людзі, якія жывуць у Прыбалтыцы,— не літоўцы, не латышы, не эстонцы, а людзі, якія прыехалі туды жыць,—яны не вінаваты. Гэта — савецкія людзі, выхаваныя ва ўмовах сацыялістычнага ладу. Гэта — людзі пэўных перакананняў, у тым ліку і камуністычных, і з гэтым трэба лічыцца. Яны таксама маюць права на павагу, на талерантныя адносіны, на спачуванне. Ім надзвычай цяжка. Не заўсёды яны па сваёй віне, сваёй уласнай волі туды паехалі, але калі і па ўласнай волі, то яны паехалі з поўным даверам, што гэта нашы, савецкія сацыялістычныя рэспублікі і мы там будзем жыць, працаваць, як савецкія людзі. І ствараць ім сёння горшыя ўмовы жыцця нельга. З гэтым, аднак, не ўсе ў Прыбалтыйскіх рэспубліках, ды і ў іншых, як мы ведаем, хочуць лічыцца, і многія не лічацца з гэтым.

Маё асабістае, агульнае ўражанне на сённяшнюю Літву—нейкая тупіковасць сітуацыі, якая склалася.Ідэя самастойнасці, суверэннасці, незалежнасці ахапіла, бадай, усіх літоўцаў і многіх нелітоўцаў. Розніца толькі ў разуменні спосабаў і тэрмінах атрымання гэтай незалежнасці.

Учарашняе пахаванне ахвяр у Вільнюсе засведчыла, што масы літоўскага народу вельмі рашуча настроены адстойваць сваё права на самастойнасць. Мне цяжка сказаць, ці іх было 200 тысяч, ці 300 тысяч, ці паўмільёна, таму што былі запруджаны народам літаральна ўсе вуліцы, усе плошчы. Я ў сваім жыцці ніколі падобнага не бачыў і сумняваюся, ці давядзецца яшчэ калі-небудзь убачыць такое пахаванне, такую ўзбуджанасць з аднаго боку. І з другога боку — такую гатоўнасць спакойна, стрымана вырашаць свае праблемы. Дарэчы, прыемна ўразіла нас і работа літоўскага парламента: вельмі спакойная, без нейкіх эмацыянальных перахлёстаў, і абмеркаванне, і галасаванне па-дзелавому стрыманыя, так, як мне ўяўляецца, і павінна быць.

Рашаць пытанні, якія склаліся,— нацыянальныя пытанні — трэба было шмат раней, але іншага выйсця ў нас няма, як рашаць іх зараз. Хоча хто ці не хоча, міла каму ці не міла, а павароту назад не будзе. Народы і рэспублікі прачнуліся і будуць сцвярджаць сваё права на суверэннасць, на самастойнасць і незалежнасць. Калі гэтага не зразумець і не павярнуцца да гэтай праблемы душой і сэрцам, гаварыць пра падпісанне Саюзнага дагавору, пра заключэнне гэтага дагавору проста, на маё перакананне, няма сэнсу. Ён не будзе падпісаны. Відаць, падпісанне яго не такое блізкае, як нам уяўляецца.



Гэтыя фотаздымкі зроблены ў Вільнюсе ў дзень пахавання ахвяр жорсткага і трагічнага супрацьборства.

Фота У. ШУБЫ.

# ЧАРНОБЫЛЬ УВАРВАЎСЯ Ў КОЖНАЕ ЖЫЦЦЁ

Жаданне пазнаёміцца з Беларуссю, на свае вочы ўбачыць маштабы вынікаў аварыі на Чарнобыльскай АЭС прывяло ў кастрычніку мінулага года на нашу зямлю свяшчэнніка з Нью-Йорка Пола Моара і яго сябра пісьменніка Майкла Крысцінсана. Убачанае ўзрушыла. Усяго тры дні правялі яны ў рэспубліцы, наведалі НДІ радыяцыйнай медыцыны, дзіцячы гематалагічны цэнтр, НДІ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі, Дом дзіцяці, пазнаёміліся з працай Беларускага аддзялення Савецкага дзіцячага фонду імя У. І. Леніна.

Адразу з радыёстудыі Мінска прагучаў іх заклік да амерыканцаў аказаць пасільную дапамогу дзецям, якія пацярпелі ад аварыі.

І вось напярэдадні Новага года Пол Моар зноў у Беларусі. З адкрытым сэрцам сустракалі нашы землякі амерыканскага свяшчэнніка, яго жонку Шарон, сына Пауля, мужа і жонку Майкла і Бекі Крысцінсанаў, даючы зразумець, што вышэй за ўсякія падарункі цэняць у нас шчырасць, жаданне раздзяліць бяду.

Насычаным сустрэчамі аказаўся тыдзень візіту. Госці мелі магчымасць пазнаёміцца з усімі бакамі жыцця рэспублікі, пабываць у раёнах, што пацярпелі ад катастрофы, а таксама прыняць удзел у святкаванні Новага года і Каляд.

Людзі, сустрэчы, наш лад жыцця — усё гэта складвалася ў паняцце Беларусь. На прэс-канферэнцыі з нагоды завяршэння візіту Пол Моар сказаў:

— Сто дзён назад я нічога не ведаў пра Беларусь. Для нас, амерыканцаў, Савецкі Саюз — гэта адна вялікая тэрыторыя, і паняцце Беларусь проста не ўкладвалася ў маёй галаве. Аказваецца, гэта прыгожы край, добразычлівыя, чулыя людзі, багатая традыцыямі нацыянальная культура.

Гэты край спасцігла вялікая бяда. Калі мы ўсё ўбачылі ў час першага візіту, то зразумелі: заставацца ў баку ад вашага гора не маем права. Мы захварэлі на вашу хваробу.

Разумею, што аказаная дапамога — тры тоны медыкаментаў і вітамінаў — гэта нямнога. І мы гатовы працягваць збор ахвяраванняў, тлумачыць сваім суграмадзянам неабходнасць гэтага. Аб дзецях больш за ўсё баляць нашы сэрцы, таму наша супрацоўніцтва з аддзяленнем дзіцячага фонду стане пастаянным. У маі мы зноў прыедзем да вас з новым грузам гуманітарнай дапамогі.

Не засталося раўнадушным да бяды беларускіх дзяцей і сэрца сямнаццацігадовага Пауля Моара. Чарнобыль закрануў і яго лёс. У час першага візіту ў адной з бальніц юнак пазнаёміўся з беларускай дзяўчынкай Наташай. Іх знаёмства не было доўгім, але адбылося нешта такое, што прымусіла Пауля зусім па-іншаму зірнуць на навакольнае жыццё, на гора, якое спасцігла Наташу. Ён абяцаў дзяўчынцы хутка вярнуцца, яна абяцала чакаць. І Наташа дачакалася. Яны яшчэ паспелі некалькі дзён правесці разам, сказаць адзін аднаму самае галоўнае... Яна сканала на яго руках.

Памяць аб Наташы яшчэ не раз пакліча Пауля ў Мінск, як кліча сюды пачуццё спагады яго бацьку, маці, Крысцінсана. І мы будзем рады зноў і зноў бачыць гэтых міласэрных амерыканцаў на нашай зямлі.

В. ШПОТА.

# АД «ПОЛАЦАКА» ДА «АРАЎ-ПАРКУ»

Неабходна адзначыць, што эміграцкая беларусазнаўчая навука нямала зрабіла ў галіне даследавання жыцця і творчасці Скарыны і Багушэвіча, пра што сведчаць публікацыі ў «Запісах» Нью-Йоркскага інстытута беларускай навукі і мастацтва, асобныя кнігі і, у прыватнасці, фундаментальная бібліяграфічная праца доктара Вітаўта Тумаша «Пяць стагоддзяў Скарыніяны», якая летась пабачыла свет у Нью-Йорку. Застаецца толькі шкадаваць, што пра гэтыя выданні, як і ўвогуле пра жыццё беларускай эміграцыі, яе навуку, прозу, паэзію, драматургію, мастацкі пераклад, музыку, выяўленчае мастацтва і шмат іншае, мала што ведаюць нават нашы навукоўцы, ужо не кажучы пра так званага «масавага» чытача. Ды, здаецца, лёд кранаецца. Ва ўсякім разе наш Інстытут літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР мае намер у самы бліжэйшы час прыступіць да аб'ектыўнай навуковай распрацоўкі праблем беларускай эміграцкай літаратуры, крытыкі і літаратуразнаўства.

Наладжваць нармальныя культурныя і дзелавыя сувязі з нашымі зарубежнымі суайчыннікамі, як гэта, дарэчы, робяць суседзі, вывучаць іх гісторыю, культуру, навуку — пачынаць гэта, на добры толк, трэба было гадоў 30—40 назад. І тады б сяму-таму не мроіўся ў кожным эмігранце вораг і здраднік. І ў такім разе, магчыма, многія рэчы (русіфікацыя, дэнацыяналізацыя, нараджэнне культаў і кульцікаў) мы разгледзелі б і штосьці зрабілі б нашмат раней, а не цяпер, на схіле XX стагоддзя. Пачытайце беларускія эміграцкія выданні 50—70-х гадоў. Што турбавала нашых суайчыннікаў: закрыццё беларускіх школ, скарачэнне выданняў на беларускай мове, сляпая залежнасць ад таго, што сёння называюць «цэнтрам»...

І хіба ж гэта на бяду — мець справу з разумнымі, талковымі людзьмі, у якіх за плячыма пэўны вопыт у сферы навукі, культуры, бізнесу, гандлю, абслугоўвання і г. д., і якія да таго ж з'яўляюцца тваімі землякамі, размаўляюць на тваёй мове, любяць тваю радзіму і жадаюць ёй толькі дабра? Пытанне не такое ўжо і рытарычнае, для беларусаў. прынамсі... Але вернемся на XIX сустрэчу...

Чарнобыльскі боль... Драматызм сённяшняга дня Беларусі... Непрадказальнасць заўтрашняга.., Пра гэта так ці інакш ішла гаворка ў кожным выступленні, і кожны аратар заклікаў прысутных ратаваць Бацькаўшчыну ад чарнобыльскай бяды. Кранулі душу словы прадстаўніка Кліўлендскай хрысціянскай дабрачыннай фундацыі Джорджа Коўэна, які не з'яўляецца беларусам па паходжанню і які заявіў аб гатоўнасці сваёй арганізацыі аказаць дапамогу ахвярам Чарнобыля.

З трыбуны XIX сустрэчы беларусаў Паўночнай Амерыкі выказваліся нараканні ў адрас урада Беларусі, які занадта доўга марудзіў і не звяртаўся да міжнароднай супольнасці з просьбай аб дапамозе ў ліквідацыі вынікаў чарнобыльскай катастрофы. Больш таго, некаторыя прамоўцы з трывогай падкрэслівалі, што гэта належным чынам не зроблена і да цяперашняга часу. У выніку многія жыхары Канады, ЗША, іншых краін не ўсведамляюць рэальных маштабаў трагедыі і не могуць прыняць удзелу ў аказанні дапамогі.

З вялікай увагай былі заслуханы выступленні Ю. Хадыкі аб эканамічнай і палітычнай сітуацыі ў сённяшняй Беларусі і А. Белага, які зачытаў прывітанне ад Згуртавання беларусаў свету «Бацькаўшчына» і расказаў аб мэтах і задачах гэтай арганізацыі.

У скандэнсаванай форме найбольш істотныя думкі і меркаванні ўдзельнікаў XIX сустрэчы беларусаў Паўночнай Амерыкі знайшлі сваё адлюстраванне ў рэзалюцыі, кожны пункт якой мае непасрэднае дачыненне да Беларусі. Таму ёсць сэнс прывесці гэты дакумент без скарачэнняў.

**«Мы, удзельнікі 19-й Сустрэчы Беларусаў Паўночнай Амерыкі, зьехаўшыся са Злучаных Штатаў, Канады, Беларускай ССР, Беласточчыны, Віленшчыны, Англіі, Францыі, Заходняй Нямеччыны ў беларускае селішча Полацак у горадзе Кліўленьдзе, штат Агаё, ЗША, заслухаўшы прывітаньні ад Прэзыдэнта Джорджа Буша, Кангрэсу Злучаных Штатаў, прадстаўнікоў мясцовых уладаў ды ад беларускіх арганізацыяў, выслухаўшы выступленьне кангрэсменкі Мэры Роўз Оўкер, урачыста дэкляруем:**

**1. Рабіць захады, каб дзяржаўныя і прыватныя сэктары заходніх краінаў аказалі гуманітарную дапамогу пацярпелым ад чарнобыльскай радыяцыі на Беларусі, як гэта звычайна робіцца ў выпадках вялікіх катастрофаў, імкнуцца адроджваць нацыянальную культуру, хрысьціянскую мараль і агульначалавечыя вартасьці.**

**2. Зьвярнуцца з просьбай ад імя беларускіх грамадаў у ЗША і Канадзе да Кангрэсу ЗША і Парляманту Канады, каб у Амэрыку й Канаду былі прынятыя квоты імігрантаў зь ліку жыхароў найбольш заражаных мясцовасьцяў чарнобыльскай зоны Беларусі.**

**3. Падтрымваць і далей дзейнасьць Беларускага Народнага фронту, скіраваную на ратаваньне жыхарства ад чарнобыльскай радыяцыі, на ратаваньне беларускае нацыі ад культурнага заняпаду, да якога давяла аднапартыйная сыстэма.**

**4. Рабіць захады для пабудовы коштам амэрыканскіх і канадзкіх фондаў анкалягічнага шпіталя ў Беларусі, у якім лячыліся-б ахвяры чарнобыльскай радыяцыі ды ў якім працавалі-б таксама і лекары з Амэрыкі й Канады.**

**5. Спрыяць усімі магчымымі спосабамі эканамічным і гандлёвым сувязям паміж амэрыканскімі, канадзкімі ды іншымі заходнімі фірмамі, з аднаго боку, і прыватнымі прадпрыемствамі Беларусі, з другога.**

**6. Спрыяць пашыраньню й замацоўваньню дыпляматычных сувязяў Злучаных Штатаў Амэрыкі і Канады зь Беларускай Рэспублікай, Вярхоўны Савет, якое абвесьціў 27 ліпеня сёлета Беларусь сувэрэннай дзяржавай.**

**7. Падтрымваць справу як мага больш шырокага навуковага, культурнага і турыстычнага абмену паміж Паўночнай Амэрыкай і Беларусяй, прыезду ў Злучаныя Штаты й Канаду беларускіх студэнтаў на навуку, спэцыялістаў рознага профілю, у тым ліку сельскагаспадарчага, на практыку, моладзі на азнаямленьне з жыцьцём Беларусаў Амэрыкі й Канады.**

**8. Мы падтрымваем ініцыятыву аргкамітэту згуртаваньня «Бацькаўшчына» ў Менску дзеля аб'яднаньня Беларусаў сьвету, каб супольна спрыяць, «кажучы словамі аргкамітэту са «Звароту да Беларусаў сьвету», «нацыянальнаму адраджэньню ўсяго беларускага народу, палітычнаму і эканамічнаму сувэрэнітэту Беларусі».**

**9. Мы вітаем намаганьні ў колах беларускага грамадзтва, скіраваныя на рэалізацыю Закона аб дзяржаўнасьці беларускае мовы, які ўвайшоў у сілу ўчора, 1-га верасьня 1990 году.**

**10. Мы зварачаемся з просьбай да ўладаў Беларускай ССР, каб было спынена накладаньне мыта на дазымэтры, якія жыхары Рэспублікі дастаюць ад сваіх суродзічаў з-за мяжы.**

**11. Мы выказваем непакой з прычыны нарастаньня антыбеларускай акцыі на Беласточчыне, якая выяўляецца ў хлусьлівай прэсавай кампаніі ды ў паленьні цэркваў і нішчэньні помнікаў беларускай культуры. Нас таксама трывожаць выпадкі частага прападаньня ў дарозе да адрасатаў у БССР і Польшчы беларусаведных публікацыяў, у тым ліку зборнікаў мастацкае літаратуры і навуковых артыкулаў, рэлігійных выданьняў.**

**12. Мы поўнімся надзеяй, што працэс дэмакратызацыі ў Беларусі будзе паглыбляцца й замацоўвацца, спрыяючы палепшаньню эканамічнага дабрабыту й культурнага росквіту Беларускага народу ды ўзмацненьню мірнага супрацоўніцтва паміж народамі Беларусі, Злучаных Штатаў Амэрыкі і Канады».**

А як ацэньваюць вынікі і ход XIX сустрэчы яе непасрэдныя ўдзельнікі? Менавіта з такім пытаннем я звярнуўся да сваіх субяседнікаў.

**Вячаслаў СТАНКЕВІЧ—кіраўнік беларускай секцыі радыё «Свабода» (Мюнхен):** «XIX сустрэча беларусаў Паўночнай Амерыкі пакідае самае светлае ўражанне. Адметнасць яе ў тым, што ўпершыню ў ёй прынялі ўдзел прадстаўнікі БССР. Спадзяюся, што ва ўмовах вашай перабудовы і пашырэння дэмакратыі такія кантакты будуць развівацца і надалей».

**Архіепіскап МІКАЛАЙ (Таронта):** «Наша сустрэча мела на мэце актывізацыю сувязяў з Бацькаўшчынай, пошукі агульнай мовы з вамі, прадстаўнікамі Беларусі. Я лічу, што сёння, у час перабудовы і большае свабоды, мы павінны і можам знаходзіць шляхі да лучнасці на будучыню і сумесна ачысціць нашу мову. Мяне не радуе стан беларускай мовы ў царкве. Трывожыць тое, што рымска-каталіцкая царква няўхільна пашырае свой уплыў на Беларусі і тым самым паланізуе частку беларускага насельніцтва. Хацелася б, каб пры нашай падтрымцы родная мова атрымала годнае месца ў храмах Бацькаўшчыны. Я ведаю, што зараз у Менску рыхтуецца да выдання пераклад Святога пісання на беларускую мову. Было б добра, каб перакладчыкі арыентаваліся не на расейскі тэкст, а на ангельскі пераклад Джэмс, зроблены ў пачатку XVII стагоддзя. На мой погляд, гэты пераклад стаіць найбольш блізка да арыгінала. Са свайго боку, я быў бы гатовы даць адпаведныя кансультацыі перакладчыкам.

Мы адабраем Закон аб беларускай мове, які пачаў дзейнічаць з верасня. Мы падтрымліваем Беларускі народны фронт «Адраджэнне», чыя дзейнасць скіравана на дасягненне поўнай незалежнасці і дабрабыту нашага народа.

Я моцна перажываю бяду, што навалілася на наш край у выніку чарнобыльскай катастрофы. Многія звяртаюцца да мяне з просьбай аб паратунку. Мы, вядома, не можам дапамагчы кожнаму, але робім усё магчымае, каб наладзіць збор сродкаў для дапамогі нашым людзям. У даны момант мы хочам набыць «Скэнэр» (ультрагукавы тамограф) коштам каля 70 тысяч долараў і перадаць яго на Бацькаўшчыну.

Мы ўважліва сочым за грамадска-палітычнымі падзеямі на Радзіме і вельмі не хацелі б, каб там дайшло да канфрантацыі, да братазабойства. Наш народ і так праліў занадта шмат крыві. Ніхто не ведае, колькі людзей злажылі свае галовы ў Курапатах, ніхто не ведае, колькі такіх Курапатаў на нашай шматпакутнай зямлі.

Я шчыра жадаю, каб наш народ меў надзею на будучыню, каб знайшоў разумнае выйсце са складаных сітуацый, куды ён трапіў не па сваёй волі, а па віне суседзяў.

Ад усяго сэрца я зычу беларускаму народу трываласці, моцы, веры ў лепшае, веры ў Бога, надзеі на выжыванне і росквіту, як у часы Вялікага княства Літоўскага».

**Мікола ГАНЬКО (Таронта):** «Два гады назад у Таронта адбылася XVIII сустрэча беларусаў Паўночнай Амерыкі, якая, на маю думку, стала ступенькай ці падрыхтоўчым этапам да нашай сённяшняй сустрэчы. Тады з дапамогай беларусаў Беласточчыны нам удалося наладзіць кантакт з Бацькаўшчынай.

Як суарганізатар гэтай сустрэчы, я нясу адказнасць за яе пасяховае правядзенне, за нашу супольную працу і павінен сказаць, што я больш чым задаволены вынікамі нашага сходу.

Мы пазнаёміліся з прадстаўнікамі з БССР, з іх думкамі і меркаваннямі аб становішчы спраў на Беларусі. Мы прыйшлі да агульнай высновы, што паправіць жыццё ў Беларусі можна толькі агульнымі намаганнямі, толькі ў цесным супрацоўніцтве ўсіх зацікаўленых бакоў. Важную ролю пры гэтым павінна адыграць пазітыўная інфармацыя аб усім, што адбываецца ў рэспубліцы.

Не толькі я асабіста, а і ўся наша беларуская калонія ў Канадзе душой і сэрцам разам з беларускім народам. Мы шлём яму паклон і зычым вылечыць яго фізічныя і духоўныя раны, стацца гордым і раўнапраўным народам сярод народаў свету і перастаць, нарэшце, быць ніцкапаклоннікам вялікіх і моцных».

**Леанід КАЗЫРА.**

**Працяг. Пачатак у №№ 2, 3.**



Першыя заняткі пачаліся ў акадэміі менеджэраў і сацыяльных педагогаў, створанай на базе Мінскага інстытута культуры. У акадэміі два заснавальнікі — Фонд развіцця малых прадпрыемстваў і Фонд сацыяльнай рэабілітацыі інвалідаў. Галоўная мэта — падрыхтоўка спецыялістаў, якія здолелі б ва ўмовах рынку змагацца за інтарэсы маладых людзей, хто не ўмее пастаяць за сябе. Тут вучаць мастацтву нестандартнага пошуку рашэнняў у вострых жыццёвых сітуацыях.

**НА ЗДЫМКАХ:** член праўлення ўсесаюзнага клуба «Што! Дзе! Калі!» Барыс БУРДА (у цэнтры) праводзіць са слухачамі спаборніцтва па папулярных інтэлектуальных гульнях; у дзелавой гульні заняты ўсе, ідзе інтэлектуальная работа, якая выключае шпаргалкі і падказкі.

Фота А. НІКАЛАЕВА.



# ?Que nos espera?

**EN LA NUEVA EUROPA, A LA CUAL DIO ORIGEN EL ENCUENTRO DE LOS LIDERES DE 34 PAISES EN PARIS**

El encuentro paneuropeo de jefes de Estado puso fin a la confrontación de los dos bloques superarmados que dividían a Europa y a Alemania en dos partes.

Por lo visto, tras esa raya en la historia de postguerra nos esperan nuevas posibilidades, pero también serias complicaciones. Al Este de Alemania se ha formado una zona "movediza" en el sentido económico y sociopolítico. Esa zona abarca a toda Europa Oriental y el territorio de la URSS.

Son muy importantes el acuerdo con Alemania y las relaciones bilaterales con otros países, pero en el futuro más nos conviene profundizar la integración europea. La comunidad europea es la garantía principal contra la repetición de los sucesos de los años 20 y 30. En ella ciframos las esperanzas de la estabilización en Europa Oriental. Sólo una Europa unificada puede prestar una ayuda eficaz y coordinada a nuestra economía desmoronada.

El la política cualquier exageración puede llevar al desastre. De allí la segunda variante indeseada del desarrollo de los sucesos. Europa puede convertirse rápidamente en un monolito que bien podrá pretender a ser una nueva superpotencia con fuerzas nucleares unidas, fuerzas espaciales y una política propia en las relaciones con el Tercer Mundo en el tráfico de armas, en la rivalidad por las fuentes de materias primas, etc. Tal desarrollo de los sucesos sería destructivo para la seguridad regional y global. La prevención de tal variante es otra de las supertareas de la política de Moscú.

La pronta desaparición del Tratado de Varsovia y la reducción de armamentos en el marco del convenio de Viena aumentarán inevitablemente la presión desde ambos lados del Atlántico para que sean evacuadas las tropas norteamericanas desde el continente europeo. Al parecer, tal variante debería ser la más feliz para nosotros. Pero con el cese de la presencia norteamericana en Europa no habrá una casa común, sino una "Europa-fortaleza", cuyas troneras apuntarán a la URSS. ¿Por qué? Pues, porque la situación en nuestro país es inestable y difícil de predecir.

Para evitarlo es necesario, en particular, que en las futuras negociaciones con EE.UU. acerca de los sistemas estratégicos, en la elaboración de un nuevo tratado SALT sobre las armas nucleares tácticas y sobre las marinas de guerra se tomen en cuenta los compromisos de los norteamericanos con sus aliados. Tal "enlace" puede ser de gran provecho para nosotros. Debemos resistir a la tentación de meter cizaña en las relaciones de estos países en la esfera de la seguridad. Para ello hay que revisar nuestro rumbo político tradicional. Y hace falta hacerlo precisamente en el momento en que para tal seguridad se han formado las condiciones más favorables. O sea, nuestro objetivo consiste en que la integración europea (incluida la integración en la esfera militar) esté incorporada a los sistemas de seguridad global y regional que ahora ligan a la URSS con EE.UU. y que deberían vincular también a los países de la región de Asia y del Pacífico.

Por fin, existe la tercera amenaza: el renacimiento de la guerra fría a lo largo de las fronteras occidentales de la URSS. En esta esfera sería decisiva la política de Moscú en las relaciones con los Estados euroorientales, debiéndose tomar en consideración los posibles conflictos que provocará la retirada de las tropas soviéticas de estos países. El mayor problema del presente es la Unión Soviética. Las perspectivas de nuestras reformas y los posibles caminos para salir de la crisis económica, interétnica y política son los factores principales que influirán de manera decisiva en el futuro de Alemania, de Europa y de toda la seguridad internacional.

**Alexéi ARBATOV,**
**doctor en Historia**

# QUE SUCEDIO EN PARIS

● **Fue firmado el Tratado sobre las Fuerzas Armadas Convencionales en Europa.**

La URSS podrá tener en Europa hasta 13.300 tanques, hasta 20.000 carros blindados, hasta 13.700 sistemas de artillería, hasta 1.500 helicópteros y hasta 5.150 aviones.

La cantidad total de tipos de armamentos a ser eliminados por la Organización del Tratado de Varsovia (OTV) y la OTAN asciende a unas 100.000 unidades.

● **Fue aprobada la Declaración Conjunta de la OTV y la OTAN.**

Según este documento, los Estados integrantes de las alianzas político-militares ya no son más adversarios.

● **Fue creado el Centro para Prevenir los Conflictos.**

Tendrá su sede en Viena y buscará soluciones políticas a las situaciones explosivas en Europa, garantizando la seguridad en el continente en el ambiente de cambios vertiginosos.

● **Fue constituido el Secretariado de la Conferencia para la Seguridad y Cooperación en Europa.**

Su sede se encontrará en Praga y tendrá como tarea coordinar todas las actividades corrientes de la organización en los marcos del proceso paneuropeo.

● **Fue creada la asamblea parlamentaria paneuropea.**

En la misma actuarán representantes de los parlamentes de los países miembros de la CSCE. La asamblea tendrá un carácter consultivo.

Redactor de la página: K. SHELESTOVICH.



*Cuatro "puentes" radiofónicos "Minsk — Francfort del Main" fueron efectuados por Dirk Emij, periodista alemán, y los comentaristas de la radio de Minsk. Ellos se referían a la ayuda humanitaria prestada a la R.S.S. de Bielorrusia, la que más que otras quedó afectada por las consecuencias del desastre de Chernóbil. Esta ayuda se hizo posible gracias a los esfuerzos hechos por la radio, televisión, gobierno federal del estado de Hessen, "La misa cristiana de la paz" y otras organizaciones sociales de Alemania.*

*EN LA FOTO: D. EMIJ (a la izquierda) y V. SKVORTSOV están realizando uno de los "puentes" radiofónicos "Minsk — Francfort del Main".*

*Foto: V. VITCHENKO*

# Libertad de conciencia y la unidad de la iglesia

**El Concilio Pontifical de la Iglesia Ortodoxa Rusa, celebrado del 25 al 27 de octubre, aprobó tres documentos: dos Definiciones: "Sobre la Iglesia Ortodoxa Ucraniana" y "Con motivo de la promulgación de la Ley "Sobre la libertad de conciencia y las organizaciones religiosas", y la "Exhortacion" con motivo del traspaso de algunas comunidades de la Iglesia Ortodoxa Rusa a la jurisdicción de la Iglesia Ortodoxa Rusa en el Extranjero.**

De ahora en adelante la Iglesia Ortodoxa Ucraniana designará ella misma a sus obispos, los cuales, a su vez, elegirán a su Primado, al Metropolita de Kiev y de Toda Ucrania, quien será miembro permanente del Sagrado Sínodo de la Iglesia Ortodoxa Rusa. La autoadministración de la IOU abarcará sus actividades económicas, ilustradoras, filantrópicas y otras.

Hace un año el obispo Ioann (Bondarchuk) informó al Sagrado Sínodo de que él abandonaba la jurisdicción de la IOR y recibía el título de arzobispo de la Iglesia Autocéfala Ortodoxa Ucraniana (IAOU) en EE.UU. de manos del metropolita Mstislav (Skripnik), que encabeza esta Iglesia. Desde aquel momento el cisma de la otrodoxia pasó del extranjero a Ucrania.

Según la encuesta realizada por el Instituto de Sociología de la AC de la URSS, en los meses de mayo y abril de 1990 la IAOU era apoyada por un 15 por ciento de la población de la región de Lvov (la mayor en la URSS por la cantidad de parroquias ortodoxas), mientras que en junio esa iglesia ya era apoyada por un 19% de habitantes. El crecimiento de los partidarios de la IAOU se debe a la disminución de los partidarios de la ortodoxia, reconocida oficialmente: en esos meses su número se redujo del 28 al 25 por ciento.

No hay duda de que las simpatías hacia la IAOU en Ucrania crecen a la par con los ánimos independistas. La proclamación de la independencia de la Iglesia Ortodoxa Ucraniana tiene la misión de detener el cisma.

Por otra parte, la nueva Ley sobre la libertad de conciencia permite a diez ciudadanos mayores de edad crear su organización religiosa, la cual puede recibir la personería jurídica. "Con ello crecen las posibilidades del cisma", —declaró Filaret, metropolita de Kiev y de Toda Ucrania. Parece que precisamente por ello el Concilio Pontifical declaró que era necesario otorgarle la personería jurídica sólo a toda la Iglesia, en general. Con ello la separación de cualquier parroquia automáticamente la priva de todo status oficial.

El problema de la superación del cisma es enfrentado no sólo por la Iglesia Ortodoxa Ucraniana. También en la Federación Rusa varias parroquias declararon su traspaso a la jurisdicción de la Iglesia Ortodoxa Rusa en el extranjero.

Kiril, arzobispo de Smolensk y de Kaliningrado, dijo durante la rueda de prensa, celebrada al finalizar el Concilio: "Durante setenta años fuimos perseguidos. Luego nos encontrábamos en un fuerte abrazo de las autoridades, del cual crujían nuestras costillas. Ahora entramos en el período del cisma. Pero esperamos que llegará el momento en que la Iglesia Ortodoxa Rusa logre renovarse y contribuir a la renovación de la sociedad".

**Alexandr MINEEV**

# LICEO EN ZHODINO

**Zhódino, un poblado en las cercanías de Minsk, famoso por su industria de camiones de gran tonelaje marca "BelAZ" cuenta con su liceo.**

En comparación con los liceos moscovitas, en el de Zhódino los primeros siete años los niños estudian de acuerdo al programa de enseñanza general. En el octavo grado ellos deben elegir las disciplinas que más les gustan entre física y matemáticas, biología y química o humanidades para su estudio más profundo. Además durante dos años ellos prueban sus fuerzas y buscan su verdadera vocación, pudiendo cambiar de materias, y sólo a fines del noveno grado deberán hacer su elección definitiva.

—Somos partidarios de una enseñanza diferenciada —dice Vladimir Kovalenko, director del liceo—. Nuestra tarea principal consiste en brindar a los niños la posibilidad de revelar sus capacidades, de demostrar su valer. Por supuesto que a la hora de organizar las clases según los intereses de los alumnos tomamos en cuenta no sólo sus capacidades (lo cual a menudo no es fácil descubrir en seguida), sino también el deseo de los niños y sus padres.

Una vez hecha la elección, en el décimo y undécimo grado los alumnos se dedican al estudio de las materias escogidas.

Cabe señalar que el complicado programa de conferencias es dictado no sólo por maestros de la escuela, sino también por profesores de centros docentes superiores. Por ejemplo, para los futuros bioquímicos ofrecen conferencias especialistas del Instituto de Investigación Científica de Agricultura de Zhódino; para los futuros físicos y matemáticos profesores del Instituto Politécnico de Bielorrusia (IPB) de la ciudad de Minsk. A propósito, el acuerdo firmado entre el liceo, el IPB y la fábrica "BelAZ" busca el objetivo de preparar un personal ingeniero-técnico calificado para dicha empresa. Además, la "BelAZ" financia el trabajo de los profesores del IPB y la enseñanza de los niños.

Los alumnos que eligieron la carrera de humanidades estudian pedagogía, sicología, metodologías de educación y hacen la práctica en la escuela en calidad de educadores. Los bioquímicos desarrollan un curso de medicina y hacen las prácticas en policlínicas y hospitales. Luego, quienes rinden bien los exámenes, ingresan automáticamente en un determinado centro docente.

En el liceo existe también una orientación más, la de arte y arquitectura, según la cual los niños estudian la historia del arte mundial, se dedican a la pintura, el grabado, la escultura.

También existen cursillos facultativos sobre jurisprudencia, cultura de la vida familiar, pedagogía, historia de la cultura mundial. En un futuro próximo se planifica introducir el estudio de la Biblia.

— A partir del próximo año lectivo —agrega el director— pensamos dictar clases de bielorruso e idiomas extranjeros desde el primer grado.

Dicho liceo ha despertado el interés de sus colegas franceses, con los cuales se han establecido contactos que prometen ser sumamente interesantes y provechosos.

**Natalia MAZANIK**

# ВЯЛІКАЯ, МАЛАЯ І БЕЛАЯ РУСЬ: АДЗІНСТВА І РАЗНАСТАЙНАСЦЬ

Менавіта таму нельга бачыць у барацьбе палітычных цэнтраў і процістаянне розных па паходжанні, этнічна разнародных славянскіх саюзаў, тым больш выяўляць у частцы гэтых саюзаў (напрыклад, радзімічах) нейкую «прабеларускую» ці нават «беларускую афарбоўку». Да сапраўдных беларускіх рысаў у IX—X стагоддзях было яшчэ далёка.

У складзе кожнага з асноўных племянных саюзаў Усходняй Славіі асноўным, самым вялікім у колькасных адносінах быў славянскі этнічны і моўны кампанент. Менавіта славянскае насельніцтва выступала ў розных частках вялікага рэгіёна ў якасці кансалідатара ўсіх астатніх, неславянскіх плямёнаў і народаў. Ва ўмовах іншаэтнічнага і іншамоўнага акружэння славянскае насельніцтва на поўначы і на поўдні добра адчувала, асэнсоўвала сваю агульную аснову, агульнае паходжанне, роднасць. Гэтую акалічнасць трэба лічыць галоўнай прычынай адсутнасці абсалютнага палітычнага размежавання паміж племяннымі саюзамі. Розныя цэнтры, якія фарміраваліся на аснове племянных саюзаў, не мелі больш-менш стабільных граніц, больш таго, паміж імі (цэнтрамі, саюзамі) існавалі вельмі цесныя сувязі, якія праяўляліся між іншым у «ператоках» насельніцтва з адной «зямлі» ў іншую.

Матэрыялы тапанімікі, напрыклад, сведчаць аб сувязях насельніцтва такіх параўнальна далёкіх тэрыторый, як Сярэдняе Падняпроўе, басейн Заходняга Буга, Паднястроўе, з аднаго боку, і парэчча Акі, з іншага боку. Нагадаем «пераклічку» шэрагу назваў адзначаных рэгіёнаў: горад Пераяслаўль-Хмяльніцкі і горад Пераяслаўль-Залескі (адпаведна на тэрыторыі Украіны і Яраслаўскай вобласці РСФСР); рака Дзясна (прыток Дняпра) і рака Дзясна ў раёне Пераяслаўля-Залескага; рэчкі Лыбедзь, Ірпень і Пачайна ў ваколіцах Кіева і рэчкі з аналагічнымі назвамі ў гідранімічнай сістэме вакол Пераяслаўля-Залескага; рака Лыбедзь існуе ў раёне яшчэ аднаго Пераяслаўля — Пераяслаўля-Разанскага (старажытны горад у Разанскай зямлі пры ўпадзенні Трубежа ў Аку); рака Трубеж у Сярэднім Падняпроўі і рака Трубеж побач з Пераяслаўлем-Разанскім; горад Галіч-Чэрвенскі (сучасны горад Галіч Івана-Франкоўскай вобласці) і шэраг населеных пунктаў тыпу Галіч у старажытнай Суздальскай зямлі (напрыклад, горад Галіч у сучаснай Кастрамской вобласці РСФСР); нарэшце назвы некалькіх населеных пунктаў паблізу цэнтра сучаснай Разанскай вобласці — Валынь, Трыполле, Вышгарад, якія паўтараюць адпаведныя найменні на тэрыторыі Украіны. Вучоныя тлумачаць нагаданыя і шэраг іншых паралелей у назвах міграцыйнымі рухамі ў басейн Акі, якія адбываліся, пачынаючы са старажытнасці і да новага часу (XVIII стагоддзе). Больш падрабязна гэтыя і іншыя факты тлумачацца, разглядаюцца ў кнізе: «Гідронімія України в її міжмовних і міждіалектних зв'язках» (Кіеў, 1981, с. 135—151).

Міграцыйныя рухі, «ператокі» насельніцтва, сувязі розных цэнтраў — «зямель» далі падставу летапісцу заўважыць: «И радимичи, и вятичи и северъ одинъ (гэта значыць — аднолькавы. — **А. Р.**) обычай имяху...» І калі падобныя звычаі радзімічаў і вяцічаў яшчэ можна тлумачыць агульным паходжаннем іх продкаў, то аднолькавыя звычаі радзімічаў і северан ці вяцічаў і северан маглі ўзнікнуць, сфарміравацца толькі ў выніку больш позняга ўзаемадзеяння, тэрытарыяльнай сумежнасці трох зямель — радзіміцкай, вяціцкай і северскай.

Ва ўмовах адноснай палітычнай ізаляванасці зямель першапачатковай Усходняй Славіі, такім чынам, надзвычай важнае значэнне набываў славянскі фактар, агульная моўная і этнічная аснова галоўных племянных (палітычных) саюзаў IX стагоддзя. Славянскі фактар садзейнічаў таму, што раздробленасць зямель Усходняй Славіі не толькі не ўзмацнілася, не прыняла абсалютнага характару, а наадварот, пачала ліквідавацца. Працэс «сцірання» першапачатковай раздробленасці Усходняй Славіі пачаўся яшчэ да вядомага паходу ў 882 годзе князя Алега з Ладагі, якая ў той час была цэнтрам Паўночнай Русі, на Смаленск, Любеч і Кіеў, у выніку чаго ўся тэрыторыя ад Ладагі да Сярэдняга Падняпроўя была аб'яднана ў адзіную дзяржаву. Калі б «сціранне» адрозненняў не мела месца, то наўрад ці князю Алегу ўдалося б даволі лёгка аб'яднаць велізарную тэрыторыю. Далейшыя, добра вядомыя з летапісаў, палітычныя падзеі далі моцны штуршок фарміраванню старажытнарускай народнасці, якое хуткімі тэмпамі ішло да канца X стагоддзя. У гэты час адбылося ўвядзенне хрысціянства — адзінай рэлігіі замест мноства мясцовых язычніцкіх вераванняў. Несумненна, што прыняцце новай рэлігіі магло адбыцца толькі на адным з этапаў, прычым зусім не пачатковым, складвання ўсходнеславянскай народнасці. Са свайго боку, пераможныя крокі хрысціянства значна паскорылі сам гэты працэс.

Яшчэ адным, на гэты раз прамым, а не ўскосным доказам, які дазваляе нам рабіць даныя вывады, з'яўляецца мова, менавіта тая старажытнаруская мова, на якой напісаны «Слова пра паход Ігаравы» і «Аповесць мінулых гадоў» («Повесть временных лет»). Той, хто хоць раз чытаў гэтыя і іншыя творы старажытнарускай літаратуры ў арыгінале, а не ў перакладах, не будзе сумнявацца ў рэальнасці існавання старажытнарускай (агульнаўсходнеславянскай) мовы. А калі была старажытнаруская мова, то яна, безумоўна, павінна была абслугоўваць пэўную народнасць, з'яўляцца галоўным сродкам зносін на ўсёй тэрыторыі Старажытнай Русі.

У наш час носьбіты, напрыклад, розных рускіх гаворак без цяжкасцей разумеюць адзін аднаго. Больш таго, носьбіты рускай мовы могуць без «перакладу» разумець носьбітаў беларускай ці ўкраінскай моў. Такая ўжо гістарычная асаблівасць нашых моў! Яшчэ М. Ламаносаў пісаў: «Народ российский, по великому пространству обитающий, невзирая на дальное расстояние, говорит всюду вразумительным друг другу языком в городах и в селах. Напротив того, в некоторых других государствах, например, в Германии, баварский крестьянин мало разумеет мекленбургского или бранденбургский швабского, хотя все того же немецкого народа» (М. В. Ломоносов. Полное собрание сочинений.— Т. VII.— М., 1952.— С. 590). У старажытнарускую эпоху, можна думаць, блізкасць усходнеславянскіх гаворак была не менш, калі не больш прыкметнай, бо развіццё самастойных моў ідзе па лініі павелічэння ў колькасных адносінах дыферэнцыйных моўных элементаў і форм.

Нарэшце, адзначым і такі факт: пэўную ролю ў фарміраванні старажытнарускай мовы і старажытнарускай народнасці адыграла старaславянская, ці царкоўнаславянская мова, якая абслугоўвала не толькі патрэбы царквы, але і выступала ў якасці афіцыйнай літаратурнай мовы на Русі. Яна была зразумелай асноўнай масе насельніцтва, паколькі з'яўлялася славянскай. Пад яе ўплывам хутка аформілася і пісьмовая форма ўласна старажытнарускай мовы.

С. Цярохін адмаўляе існаванне старажытнарускай народнасці, бо ён лічыць розніцу паміж усходнеславянскімі цэнтрамі, племяннымі саюзамі абсалютнай. Іншымі словамі, ён мяркуе, што на тэрыторыі Усходняй Славіі спрадвеку жылі розныя народы. Мы не абвяргаем апошні факт і таксама лічым, што на данай тэрыторыі спрадвеку жылі славяне, фіны, угры, балты, цюркі, іранцы. Згаджаемся мы і з тым, што самі славяне прыйшлі на землі, дзе іх застае старажытнарускі летапіс, рознымі шляхамі. Але такая акалічнасць зусім не дае ніякіх падстаў, каб падзяляць усходнеславянскі этнічны і моўны кампанент на «розныя народы». Калі б так было ў той час, аб якім ідзе гаворка, то літаратурныя помнікі і іншыя творы пісьменства XI—XIII стагоддзяў (менавіта да гэтага часу адносяцца самыя раннія з вядомых нам пісьмовых крыніц старажытнарускай эпохі) наглядна адлюстроўвалі б «розныя мовы» «розных народаў». Але ж гэтага няма. Пісьмовыя крыніцы даюць нам прыклады дыялектных асаблівасцей старажытнарускіх гаворак. Аднак гэтыя асаблівасці не настолькі характэрныя, каб лічыць іх прыкметамі самастойных моў. Няхай славянскія групоўкі і рухаліся на тэрыторыю Усходняй Славіі з розных бакоў — і з поўдня, і з захаду, і з паўночнага захаду. Усё гэта бясспрэчна. Але бясспрэчна і тое, што даны факт нельга даводзіць да абсурду. Кожны народ калісьці аднекуль прыйшоў. Але ж ён аформіўся як пэўны народ менавіта на той зямлі, дзе жыве і цяпер. Так і ўсходнія славяне сталі менавіта **ўсходнімі** на тэрыторыі ад Ладагі і Ноўгарада да Сярэдняга Падняпроўя. Вось чаму ранні старажытнарускі перыяд (IX—XI стагоддзі), на працягу якога разам з умацаваннем Русі як цэнтралізаванай дзяржавы адбывалася фарміраванне славянамоўнай старажытнарускай народнасці, у гісторыка-лінгвістычным плане можа быць ахарактарызаваны як перыяд уніфікацыі неаднародных славянскіх гаворак, якія ўвайшлі ў сацыяльную сістэму мовы старажытнарускай (усходнеславянскай) народнасці. Яшчэ ў VII—VIII, а потым і ў IX—XI стагоддзях ішоў працэс інтэграцыі ўсходнеславянскіх гаворак, вынікам якога з'явілася распаўсюджанне агульных усходнеславянскіх моўных рыс, што так выразна адрозніваюць усходнеславянскія гаворкі і мовы ад заходне- і паўднёваславянскіх. Мы не маем магчымасці ў неспецыяльным газетным артыкуле аналізаваць гэтыя асаблівасці, таму адсылаем чытачоў, якія цікавяцца даным пытаннем, да адпаведнай літаратуры: Г. П. Півторак. Формування і діалектна диференціація давньоруської мови.— КИІВ, 1988; Ф. П. Филин. Происхождение русского, украинского и белорусского языков.— Л., 1972.

З канца IX стагоддзя на тэрыторыі Усходняй Славіі пачалася барацьба палітычных цэнтраў за першынство, за лідэрства. Але найбольш рэальныя прэтэнзіі на дамінуючую ролю прадставілі два цэнтры — паўночны (славенска — крывіцка — чудскі) і паўднёвы (кіеўска — палянскі). Гэта і не выпадкова, бо яны знаходзіліся на двух палярных пунктах вялікага стратэгічнага шляху «з варагаў у грэкі». Астатнія цэнтры ў той час не мелі рэальных шансаў на ролю лідэра - кансалідатара па розных прычынах (радзімічы, вяцічы і северане, напрыклад, плацілі даніну хазарам). Калі б гісторыя распарадзілася інакш і паміж «паўночным» і «паўднёвым» цэнтрамі ішла роўная, без яўнай перавагі барацьба за лідэрства, то тэрыторыя Усходняй Славіі, хутчэй за ўсё, ужо ў X стагоддзі распалася б на дзве дзяржавы, граніца паміж якімі праходзіла б прыкладна па тэрыторыі сённяшняй цэнтральнай Беларусі, і ў межах кожнай з дзвюх дзяржаў хутка склаліся б дзве самастойныя народнасці. Гісторыя магла распарадзіцца і інакш: перамог бы які-небудзь адзін цэнтр — паўночны ці паўднёвы і ўстанавіў бы васальную залежнасць ад сябе таго цэнтра, які прайграў. У такім выпадку ўсё роўна ішло б фарміраванне дзвюх народнасцей, толькі гэты працэс быў бы значна больш доўгім і складаным. Аднак процістаянне двух цэнтраў — паўночнага і паўднёвага, якое прыкметна абвастрылася ў канцы IX стагоддзя, было ліквідавана амаль унікальным спосабам — шляхам аб'яднання паўночнай і паўднёвай частак Усходняй Славіі. Зразумела, што гэтаму аб'яднанню папярэднічала перамога паўночнага цэнтра, але гэта перамога была, хутчэй, палітычнай, чым ваеннай, бо летапіс не рысуе нам крывавых сутыкненняў у час паўднёвага паходу князя Алега ў 882 годзе. Тое, што Алегу ўдалося менавіта аб'яднаць, а не заваяваць увесь стратэгічны шлях «з варагаў у грэкі», даказваецца двума фактамі. Першы з іх — гэта перанос сталіцы ў Кіеў. Другі — хуткае распаўсюджанне этнічнай і геаграфічнай назвы **русь (Русь)** па ўсёй тэрыторыі аб'яднанай дзяржавы. Другі з нагаданых фактаў патрабуе некаторых каментарыяў.

Найменне «Руская Зямля», як сведчаць пісьмовыя крыніцы старажытнарускага часу, разумелася ў вузкім і шырокім сэнсе. У вузкім сэнсе **Руская Зямля** — гэта тэрыторыя вакол Кіева, Пераяслаўля і Чарнігава, гэта значыць у Сярэднім Падняпроўі. У шырокім сэнсе **Руская Зямля** — гэта тэрыторыя ўсёй Старажытнарускай дзяржавы. Якое разуменне — у шырокім ці ў вузкім сэнсе — было першапачатковым? Рускія летапісы і замежныя крыніцы X стагоддзя дазваляюць зрабіць вывад, што найменне **Русь** у гэты час разумелася ў шырокіх граніцах. Але ж да X стагоддзя адносіцца і ўпамінанне трыадзінства Кіева, Чарнігава і Пераяслаўля, праўда, без суаднясення іх з «Рускай Зямлёй» (гл. аб гэтым падрабязны рэдакцыйны каментарый у кнізе: Х. Ловмяньский. Русь и норманны.— М., 1985, с. 278). Слова **русь** у этнічным і геаграфічным **(Русь)** сэнсах па сваёй структуры стаіць у адным радзе з аналагічнымі найменнямі заходнефінскіх народаў і іх зямель **(весь, корсь, чудзь** і іншых). Хутчэй за ўсё, слова **русь (Русь)** нарадзілася ў IX стагоддзі ў паўночнай частцы ўсходнеславянскага арэала ў выніку ўзаемадзеяння славянскіх і фінскіх плямёнаў у складзе племяннога саюза славен, крывічоў, чудзі, меры і весі. Тут слова **русь (Русь)** аформілася і як этнічнае, і як геаграфічнае паняцце. Менавіта для фінаў было характэрным абазначэнне з дапамогай адной і той жа формы слова і народа, і тэрыторыі, на якой даны народ пражывае. Пасля аб'яднання паўночнай і паўднёвай частак Усходняй Славіі і пераносу сталіцы ў Кіеў слова **русь (Русь)** хутка перавандравала на поўдзень і замацавалася за той часткай «паўднёвай» Усходняй Славіі, якая прымыкала да новага цэнтра дзяржавы — Кіева. Гэтая Русь у вузкім сэнсе была свайго роду «Малой Руссю» ў адрозненне ад «Русі Вялікай» — той паўночнай часткі Усходняй Славіі, дзе ўпершыню ўзнікла назва **Русь (русь)**. Не выпадкова расійскі гісторык Васіль Тацішчаў адзначаў наступнае: «Великая Россия есть главный предел в Российской империи, лежащая к северу. Сея страны границы: на север до моря Северного, на восток по Тверь и княжение Ростовское, к югу включалось княжение Полоцкое и вся Ливония по Мемель, к западу море Алтиское до залива Ботнического». «Малая Русь», такім чынам, была тым кутком Рускай Зямлі, дзе пасля пераносу сталіцы ў Кіеў размяшчаўся велікакняжацкі ўдзел. Іншымі словамі, першапачатковай «Малой Руссю» лічыўся «малы» велікакняжацкі цэнтр, адкуль распаўсюджвалася вярхоўная ўлада на ўсе астатнія землі.

Вельмі хутка гэтая «Малая Русь» стала асэнсоўвацца і ўспрымацца нават як першапачатковая Русь. А такое пераасэнсаванне красамоўна сведчыла аб аб'яднанні палітычнымі сродкамі, а не шляхам вайны, насілля велізарнай усходнеславянскай тэрыторыі. Такому мірнаму аб'яднанню садзейнічаў усё той жа «славянскі фактар», аб якім ішла гаворка вышэй.

Аб'яднанне Усходняй Славіі з яе «стракатым» насельніцтвам, зразумела, нельга ўяўляць як ідылію. Мы не забываем, што кансалідацыйныя працэсы працякалі ў феадальны час разам з процілеглымі працэсамі — дыферэнцыйнымі, якія абумоўлівалі зараджэнне рэгіянальных асаблівасцей у культуры, мове, самім спосабе жыцця народаў велізарнай краіны. Ужо ў IX—X стагоддзях у пэўных рэгіёнах, напрыклад, у Прыдзвінні, на землях палачан-крывічоў, узнікалі ўмовы для складвання самастойнай, як мы яе называем, заходнерускай народнасці. Але гэта ўжо тэма для самастойнага вялікага апавядання. У нашых жа сённяшніх разважаннях мы ставім кропку ў надзеі, што ўважлівыя чытачы, якіх сапраўды цікавяць пачатковыя старонкі гісторыі роднай зямлі і якія больш цэняць ісціну, чым палітычную кан'юнктуру, абавязкова прааналізуюць нашы аргументы належным чынам.

**Аляксандр РОГАЛЕЎ,**
**кандыдат філалагічных навук, старшы выкладчык кафедры рускага, славянскага і агульнага мовазнаўства Гомельскага дзяржуніверсітэта імя Ф. Скарыны.**

Заканчэнне. Пачатак у № 3.

